В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# МАРФАЛОГІЯ

**Марфалогія** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словы як часціны мовы, іх граматычныя прыметы і формы.

**Часціны мовы** — разрады слоў, якія характарызуюцца агульнасцю значэння, марфалагічных прымет, сінтаксічнай ролі.

Часціны мовы

**самастойныя**

| назва | граматычнае значэнне (называюць) | сінтаксічная роля |
| --- | --- | --- |
| назоўнік | прадметы | |
| прыметнік | прыметы прадметаў | |
| лічэбнік | колькасць ці парадак прадметаў | |
| займеннік | указваюць на прадметы, прыметы | |
| дзеяслоў | называюць дзеянні, стан | |
| прыслоўе | называюць прыметы дзеяння, прадмета, прыметы | |



**службовыя**

| назва | роля ў мове |
| --- | --- |
| прыназоўнік | выражае адносіны паміж словамі |
| злучнік | звязвае члены сказа і часткі сказа |
| часціца | выражае дадатковыя адценні значэння ў сказе |

выклічнік → выражае розныя пачуцці і пабуджэнні → не з'яўляецца членам сказа

Службовыя часціны мовы:
а) не маюць лексічнага значэння;
б) не з'яўляюцца членамі сказа;
в) не змяняюцца.



© ТДА «Аверсэў»

# Назоўнік як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | Называе прадмет → уласны: Беларусь, Янка, Нарач; агульны: краіна, імя, возера |
| **Адказвае на пытанні** | хто? → адушаўлёныя: настаўнік, хлебароб;<br>што? → неадушаўлёныя: кніга, трактар |
| **Пачатковая форма** | Н. скл. адз. л.: Мінск, радасць, свабода, чалавек, касманаўт, зубр |
| **Марфалагічныя прыметы** | • Мае род: м. р.: паэт, сокал, камбайн; ж. р.: вучаніца, зязюля, касілка; н. р.: акно, поле, сумленне; агульны: сірата, небарака.<br>• Змяняецца па ліках: адз. л.: пісьменнік, ручка, возера; мн. л.: пісьменнікі, ручкі, азёры; толькі адз. (сум) ці мн. (сані).<br>• Змяняецца па склонах: Н., Р., Д., В., Т., М.; або нескланяльны: калібры, таксі.<br>• Адносіцца да аднаго з трох скланенняў: 1-е: дарога, зямля, вучаніца; 2-е: дом, алень, спартсмен; 3-е: ноч, радасць, аповесць; або нескланяльны: метро, фае, шымпанзэ |
| **Сінтаксічная роля** | Дзейнік, выказнік, азначэнне, акалічнасць, дапаўненне:<br>Беларусь — мая Радзіма.<br>Спевы птушак чуваць у гаі.<br>Васько ўбачыў лісіцу. |



© ТДА «Аверсэв»

# Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў

| | | |
|---|---|---|
| **агульныя**<br>назвы аднародных прадметаў, з'яў, паняццяў, асоб, істот: горад, паэт, бусел, ружа, кніга, зорка, карабель;<br>• маюць формы адзіночнага і множнага ліку: горад — гарады, касач — касачы | ← і → | **уласныя**<br>імёны, прозвішчы, псеўданімы, геаграфічныя і астранамічныя назвы і г. д.: Мінск, Якуб Колас, Дняпро, «Курган» (паэма);<br>• звычайна маюць форму адзіночнага (Беларусь) або множнага ліку (Навасёлкі) |
| **адушаўлёныя**<br>асабовыя: аграном, брат, асілак, каваль; неасабовыя: вожык, верабей, ліса, пчала;<br>• адказваюць на пытанне «хто?»;<br>• у множным ліку форма вінавальнага склону супадае з формай роднага: бачу братоў, пчол, вожыкаў | ← і → | **неадушаўлёныя**<br>назвы нежывых прадметаў, з'яў, паняццяў: вецер, снег, хлеб, дрэва, сад, мора;<br>• адказваюць на пытанне «што?»;<br>• у множным ліку форма вінавальнага склону супадае з формай назоўнага: бачу дрэвы, сады, кнігі |
| **канкрэтныя**<br>назвы прадметаў, жывых істот, якія рэальна існуюць: дом, салавей, загад, дзень;<br>• змяняюцца па ліках: дом — дамы, аловак — алоўкі;<br>• спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі: два дні, тры кані | ← і → | **абстрактныя**<br>назвы пачуццяў, адчуванняў, якасцей, працэсаў, дзеянняў: гонар, туга, незалежнасць;<br>• маюць форму адзіночнага (адвага, радасць) або множнага ліку (паводзіны);<br>• не спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі |
| **зборныя**<br>абазначаюць сукупнасць аднародных прадметаў ці асоб як адно цэлае: лісце, моладзь, люд;<br>• маюць форму адзіночнага ліку: пер'е;<br>• не спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі | ← і → | **рэчыўныя**<br>абазначаюць рэчывы аднароднага саставу: малако, вадарод, шоўк, бавоўна;<br>• маюць форму адзіночнага (хлеб) або множнага ліку (суніцы);<br>• можна дзяліць, нельга лічыць |

**!** Агульныя назоўнікі могуць пераходзіць ва ўласныя (заяц і Заяц — прозвішча), а ўласныя — у агульныя (Пламбір — горад у Францыі і пламбір — гатунак марожанага)



© ТДА «Аверсэв»

# Род назоўнікаў

| Род | Паказчыкі роду | |
|---|---|---|
| | па марфалагічных прыметах | па значэнні |
| Мужчынскі | • назоўнікі з асновай на цвёрды ці зацвярдзелы, мяккі зычны з нулявым канчаткам: сокал, вуж, алень, луг, марак, гарох;<br>• назвы асоб мужчынскага полу з канчаткамі -а (-я): бацька, дзядуля | іншамоўныя нескланяльныя назоўнікі-назвы:<br>а) асоб мужчынскага полу: аташэ, янкі;<br>б) жывёл і птушак: какаду, поні, фламінга;<br>в) некаторых неадушаўлёных прадметаў: бенгалі, пенальці;<br>г) гарадоў: Сухумі, Дэлі, Глазга |
| Жаночы | • назоўнікі з асновай на цвёрды, зацвярдзелы, мяккі зычны з канчаткам -а (-я): вясна, мяжа, зямля, дарога, рака, эпоха;<br>• з асновай на мяккі зычны, радзей на ж, ч, ш, р, б, ф, ў і нулявым канчаткам (у родным склоне -і (-ы)): памяць, соль, печ, Сібір, верф, любоў | іншамоўныя нескланяльныя назоўнікі-назвы:<br>а) дзяржаў, рэк, гор, пустынь: Нікарагуа, Місуры, Гобі, Місісіпі;<br>б) асоб жаночага полу: мадам, фрау;<br>в) імёны, прозвішчы жанчын: Элен, Кармэн, Шаумян;<br>г) назоўнікі: івасі, кальрабі, цэцэ |
| Ніякі | • назоўнікі з канчаткамі -е, -о (-ё), -а: поле, акно, зерне, жыццё, рэха;<br>• назоўнікі на -мя: бярэмя, племя, семя;<br>• назвы маладых істот на -я (-ё): кацяня(ё);<br>• назоўнікі: дзяўчо, хлапчанё, дзіцяня | іншамоўныя нескланяльныя назоўнікі-назвы:<br>а) неадушаўлёных прадметаў: алібі, кіно, рагу, леча, пюрэ, фае;<br>б) азёр: Ківу, Рыца, Чад |
| • Назоўнікі *боль, дроб, жывапіс, запіс, мазоль, медаль, накіп, насып, палын, пыл, рукапіс, сабака, стэп, туфель, фальш, цень, шынель, яблык* адносяцца да мужчынскага роду, а назоўнікі *гусь, жырафа, таполя* — да жаночага.<br>• Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку, не маюць роду: дзверы, канікулы.<br>• Некаторыя назоўнікі абазначаюць асобу мужчынскага або жаночага полу па характэрнай прымеце: сірата, крыўляка, мурза, мямля і інш. Яны адносяцца да агульнага роду | | |



© ТДА «Аверсэв»

# Лік назоўнікаў

Лік назоўнікаў выражае колькасную характарыстыку прадметаў.

| Групы назоўнікаў паводле ўжывання ў формах | | |
|---|---|---|
| **адз. і мн. л.** | **толькі адз. л.** | **толькі мн. л.** |
| назоўнікі, якія абазначаюць прадметы і з'явы, што паддаюцца лічэнню і спалучаюцца з колькаснымі лічэбнікамі:<br>бусел — буслы,<br>зорка — зоркі,<br>адзін стол — пяць сталоў | 1) рэчыўныя назоўнікі: гарох, волава, кісель, соль, мука;<br>2) зборныя назоўнікі: радня, галлё, пер'е, асіннік;<br>3) абстрактныя назоўнікі: ветлівасць, цемень, смех;<br>4) назоўнікі, якія абазначаюць грамадска-палітычныя паняцці: радыкалізм, рэарганізацыя;<br>5) назвы дзеянняў, стану: касьба, дрымота;<br>6) большасць уласных назваў: Янка, Нарач, Брэст, Азія;<br>7) назвы напрамкаў свету: поўдзень, захад | 1) назвы састаўных і парных прадметаў: вароты, нажніцы, вусны, кросны;<br>2) некаторыя рэчыўныя назоўнікі: духі, біткі, апілкі;<br>3) назвы прамежкаў часу: суткі, будні, канікулы;<br>4) некаторыя назвы дзеянняў, працэсаў: выбары, роды;<br>5) назвы абрадаў, гульняў: дажынкі, жмуркі, шахматы;<br>6) назвы са значэннем сукупнасці прадметаў, з'яў, асоб: ападкі, грошы, кадры, людзі;<br>7) некаторыя ўласныя назвы: Альпы, Ашмяны |

• Асобныя адзіночналікавыя рэчыўныя і абстрактныя назоўнікі могуць ужывацца ў множным ліку для абазначэння відаў, гатункаў рэчываў (мінеральныя воды, калійныя солі), пэўных якасцей (першыя радасці), дзеянняў (гонкі).

• Формы множнага ліку ўтвараюцца ад формаў адзіночнага ліку пры дапамозе канчаткаў -ы, -і (дом — дамы, зорка — зоркі), а таксама -е (ад назоўнікаў на -ін: мазыранін — мазыране)



© ТДА «Аверсэв»

# Склон назоўнікаў

**Склон** — гэта граматычная катэгорыя, якая паказвае на адносіны назоўніка да іншых слоў у словазлучэннях і сказах. Яна выражаецца шасцю радамі канчаткаў у адзіночным і множным ліку.

| Склоны | Склонавыя пытанні | Ужываюцца з прыназоўнікамі |
|---|---|---|
| 1. Назоўны | хто? што? | ——— |
| 2. Родны | каго? чаго? | ад, з, без, да, для, з-за, акрамя |
| 3. Давальны | каму? чаму? | к, па, услед, дзякуючы |
| 4. Вінавальны | каго? што? | за, пра, праз, на, у, па, пад |
| 5. Творны | кім? чым? | за, пад, перад, за, па-за, з |
| 6. Месны | аб кім? аб чым? | у, па, на, аб, пры |

• Назоўны склон — гэта зыходная, пачатковая форма, у якой назоўнік ужываецца як назва прадметаў, асоб і г. д. Астатнія склоны — ускосныя.
• Ускосныя склоны ўжываюцца з прыназоўнікамі і без прыназоўнікаў.
• У беларускай мове некаторыя назоўнікі захавалі спецыфічны канчатак клічнай формы: сыне, гаю, доню. Але гэтая форма ў лік склонаў сучаснай беларускай мовы не ўваходзіць

# Скланенне назоўнікаў

Змяненне назоўнікаў па склонах называецца скланеннем. У залежнасці ад канчаткаў і граматычнага роду вылучаюцца тры скланенні (разрады назоўнікаў з аднолькавымі формамі змянення).

| Скланенне | Род | У пачатковай форме (Н. скл. адз. л.) канчаюцца на |
|---|---|---|
| 1-е | ж. р. | -а, -я (галава, воля) |
| 2-е | м. р. | мяккі ці цвёрды зычны з нулявым канчаткам (алень, каваль, дом, параход) |
| | н. р. | -а, -о, -е, -ё (возера, акно, насенне, галлё)<br>-мя (5: бярэмя, вымя, полымя, семя, цемя) |
| 3-е | ж. р. | мяккі ці цвёрды зычны і нулявы канчатак (даль, радасць, печ, кроў, верф) |



© ТДА «Аверсэв»

# Назоўнікі першага скланення

## Адзіночны лік

Канчаткі назоўнікаў 1-га скланення залежаць ад характару асновы і месца націску.

| Склон | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы зычны | мяккі зычны | х (с), г (з) | к (ц) |
| Н. | ха́та вясна́ | ка́ша мяжа́ | а́рмія ралля́ | уце́ха нага́ | е́лка рака́ |
| Р. | ха́ты вясны́ | ка́шы мяжы́ | а́рміі ралі́ | уце́хі нагі́ | е́лкі ракі́ |
| Д. | ха́це вясне́ | ка́шы мяжы́ | а́рміі ралі́ | уце́**с**е на**з**е́ | е́л**ц**ы ра**ц**э́ |
| В. | ха́ту вясну́ | ка́шу мяжу́ | а́рмію раллю́ | уце́ху нагу́ | е́лку раку́ |
| Т. | ха́тай(-аю)<br>вясно́й(-о́ю) | ка́шай(-аю)<br>мяжо́й(-о́ю) | а́рміяй(-яю)<br>раллёй(-ёю) | уце́хай(-аю)<br>наго́й(-ою) | елкай(-аю)<br>рако́й(-ою) |
| М. | (па) ха́це<br>(па) вясне́ | (аб) ка́шы<br>(аб) мяжы́ | (аб) а́рміі<br>(аб) ралі́ | (аб) уце́**с**е<br>(аб) на**з**е́ | (на) е́л**ц**ы<br>(на) ра**ц**э́ |

У давальным і месным склонах канчаткі залежаць ад характару асновы і месца націску:

– канчатак -е маюць назоўнікі з асновай на цвёрды зычны і на **г**, **х** (пры гэтым адбываецца чаргаванне г//з і х//с);

– канчатак -э маюць назоўнікі з асновай на **к** і націскам на канчатку (пры чаргаванні к//ц);

– канчатак -ы маюць назоўнікі з асновай на зацвярдзелы зычны і на **к** з націскам на аснове (пры чаргаванні к//ц)



© ТДА «Аверсэв»

# Назоўнікі другога скланення

## Адзіночны лік

### Неасабовыя назоўнікі

Склонавыя канчаткі назоўнікаў 2-га скланення залежаць ад характару асновы, а ў родным склоне яшчэ ад значэння, у давальным і творным — ад месца націску.

| Склон | Мужчынскі род | | | | Ніякі род | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | |
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы | мяккі | г, к, х | цвёрды зычны | зацвярдзелы | мяккі | к, х |
| Н. | дом□<br>сад□<br>стол□ | крыж□<br>верш□<br>вянец□ | кужаль□<br>гай□<br>медаль□ | круг□<br>аловак□<br>фартýх□ | лóгава<br>мы́ла<br>гняздó | вóгнішча<br>мéсца<br>плячó | зелле<br>адзенне<br>жыццё | вока<br>вуха<br>малако |
| Р. | дома<br>саду<br>стала | крыжа<br>верша<br>вянца | кужалю<br>гаю<br>медаля | круга<br>алоўка<br>фартуха | логава<br>мыла<br>гнязда | вогнішча<br>месца<br>пляча | зелля<br>адзення<br>жыцця | вока<br>вуха<br>малака |

© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Мужчынскі род | | | | Ніякі род | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | |
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы | мяккі | г, к, х | цвёрды зычны | зацвярдзелы | мяккі | к, х |
| Д. | даму<br>саду<br>сталу | крыжу<br>вершу<br>вянцу | кужалю<br>гаю<br>медалю | кругу<br>алоўку<br>фартуху | логаву<br>мылу<br>гнязду | вогнішчу<br>месцу<br>плячу | зеллю<br>адзенню<br>жыццю | воку<br>вуху<br>малаку |
| В. | як Н. (неадушаўлёныя назоўнікі) | | | | як Н. (неадушаўлёныя назоўнікі) | | | |
| Т. | до́мам<br>са́дам<br>стало́м | кры́жам<br>ве́ршам<br>вянцо́м | ку́жалем<br>га́ем<br>медалё́м | кру́гам<br>ало́ўкам<br>фартухо́м | ло́гавам<br>мы́лам<br>гняздо́м | во́гнішчам<br>ме́сцам<br>плячо́м | зе́ллем<br>адзе́ннем<br>жыццё́м | во́кам<br>ву́хам<br>малако́м |
| М. | (аб)<br>доме<br>садзе<br>стале | (аб) крыжы<br>вершы<br>вянцы | (аб) ку-<br>жалі<br>(у) гаі<br>(аб) медалі | (аб) крузе<br>алоўку<br>фартуху | (у) ло-<br>гаве<br>мыле<br>гняздзе | (аб) вогні-<br>шчы<br>месцы<br>плячы | (аб)<br>зеллі<br>адзенні<br>жыцці | (аб)<br>воку<br>вуху<br>малаку |

**!** Пры скланенні аснова назоўнікаў можа змяняцца ў выніку чаргавання зычных: г//з (круг — у крузе), к//ц (малако — у малацэ), х//с (гарох — у гаросе), т//ц (плот — на плоце), д//дз (завод — на заводзе)



© ТДА «Аверсэв»

# Канчаткі назоўнікаў другога скланення ў родным склоне

<table>
<tr><th>-а (-я)</th><th>-у (-ю)</th></tr>
<tr><td>1. Усе назоўнікі ніякага роду: возера, збожжа, галля, зерня.<br>2. Усе назвы жывых істот: вожыка, бусла, вераб'я, лася.<br>3. Назвы канкрэтных прадметаў: дома, крана, дня, аўтамабіля.<br>4. Назвы органаў, частак цела: зуба, калена, локця, хобата;<br>але: твару.<br>5. Назвы розных мер: міліметра, гектара, грама, літра.<br>6. Назвы месяцаў, дзён тыдня, грашовых і іншых адзінак: лютага, аўторка, літа, ома, снежня, рубля.<br>7. Навуковыя і тэхнічныя тэрміны: дзейніка, катэта, сінуса, артыкля, вадэвіля.<br>8. Назвы грамадскіх арганізацый, установ: камітэта, канцэрна, клуба.<br>9. Назвы танцаў, розных гульняў: факстрота, футбола, спідвея</td><td>1. Назвы абстрактных паняццяў: гонару, запавету, жалю, болю.<br>2. Назвы розных працэсаў, стану: раз'езду, холаду, спакою.<br>3. Назвы прасторавых паняццяў: абсягу, краявіду, краю.<br>4. Назвы грамадскіх фармацый, плыняў, навуковых тэорый: феадалізму, атэізму, рэалізму.<br>5. Назвы захворванняў: грыпу, інсульту, рэўматызму.<br>6. Назвы розных рэчываў: перцу, алею, паркалю.<br>7. Зборныя назоўнікі: люду, саду, рою, рэвеню.<br>8. Назвы прыродных з'яў: сіверу, дажджу, сухавею, інею.<br>9. Назвы часавых паняццяў: веку, перапынку, абеду.<br>10. Назвы розных грамадскіх падзей: кірмашу, фестывалю</td></tr>
<tr><td colspan="2">Некаторыя назоўнікі ў залежнасці ад значэння маюць канчатак -а (-я) або -у (-ю):<br>– лістапада — назва месяца; лістападу — ападанне лісця; народа — воля народа; народу — у значэнні зборным: многа народу;<br>– назвы дрэў маюць канчатак -а (-я), калі абазначаюць канкрэтнае дрэва: галіны дуба, ясеня, і канчатак -у (-ю), калі абазначаюць драўніну (набываюць значэнне рэчыўнасці, зборнасці): паркет з дубу, лыжы з ясеню;<br>– назвы кветак ужываюцца з канчаткам -а (-я), калі маецца на ўвазе адна расліна (кветка лотаса), а ў зборным значэнні — з канчаткам -у (-ю): многа лотасу</td></tr>
</table>



© ТДА «Аверсэв»

# Асабовыя назоўнікі

| Склон | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | | |
|---|---|---|---|---|
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы | г, к, х | мяккі зычны |
| Н. | пілот□<br>весялун□<br>Сымон□ | муж□<br>ткач□<br>Богуш□ | хірург□<br>пастух□<br>Гаўрук□ | геній□<br>кароль□<br>Алесь□ |
| Р. | пілота<br>веселуна<br>Сымона | мужа<br>ткача<br>Богуша | хірурга<br>пастуха<br>Гаўрука | генія<br>караля<br>Алеся |
| Д. | пілоту<br>веселуну<br>Сымону | мужу<br>ткачу<br>Богушу | хірургу<br>пастуху<br>Гаўруку | генію<br>каралю<br>Алесю |
| В. | як Р. | | | |
| Т. | пілотам<br>веселуном<br>Сымонам | мужам<br>ткачом<br>Богушам | хірургам<br>пастухом<br>Гаўруком | геніем<br>каралём<br>Алесем |
| М. | (аб) пілоце<br>веселуне<br>Сымоне | (аб) мужу<br>ткачу<br>Богушу | (аб) хірургу<br>пастуху<br>Гаўруку | (аб) генію<br>каралю<br>Алесю |

**!** Назоўнікі дзед і прадзед у месным склоне могуць ужывацца з канчаткам -е і -у: пры дзедзе і пры дзеду, аб прадзедзе і аб прадзеду

# Назоўнікі трэцяга скланення

## Адзіночны лік

| Склон | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | |
|---|---|---|---|
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы зычны | мяккі зычны |
| Н. | верф□<br>кроў□ | мыш□<br>печ□<br>Свір□ | даль□<br>вечнасць□ |
| Р. | верфі<br>крыві | мышы<br>печы<br>Свіры | далі<br>вечнасці |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Тыпы асноў і ўзоры скланення | | |
|---|---|---|---|
| | цвёрды зычны | зацвярдзелы зычны | мяккі зычны |
| Д. | верфі крыві | мышы печы Свіры | далі вечнасці |
| В. | верф□ кроў□ | мыш□ печ□ Свір□ | даль□ вечнасць□ |
| Т. | верф'ю кроўю | мышшу печчу Свір'ю | даллю вечнасцю |
| М. | (аб) верфі крыві | мышы печы Свіры | далі вечнасці |

• Форма вінавальнага склону супадае з формай назоўнага склону ў адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў.

• У творным склоне апошні зычны асновы падаўжаецца, калі знаходзіцца ў становішчы паміж галоснымі: мышшу, сувяззю, рунню.

• Калі аснова заканчваецца збегам зычных, падаўжэння не адбываецца: міласцю.

• Губныя зычныя і р не падаўжаюцца: глыб'ю, кроўю, шыр'ю.

• Назоўнік моц у творным склоне мае канчатак -ай: моцай.

• Назоўнік любоў у родным, давальным і месным склонах мае форму любві.

• У назоўніках кроў, свякроў у родным, давальным і месным склонах о чаргуецца з ы: кроў — крыві, свякроў — свекрыві

# Рознаскланяльныя назоўнікі

## 1. Назоўнікі мужчынскага роду на -а, -я

| Склон | націск на аснове | націск на канчатку | націск на аснове | націск на канчатку |
|---|---|---|---|---|
| Н. | старастa дзядзька | слуга суддзя | Вася Даніла | Фама Ілья |
| Р. | старасты дзядзькі | слугі суддзі | Васі Данілы | Фамы Ільі |
| Д. | старасту дзядзьку | слузе суддзі | Ва́сю Дані́лу | Фаме́ Ільі |
| В. | старасту дзядзьку | слугу суддзю | Васю Данілу | Фаму Ілью |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | націск на аснове | націск на канчатку | націск на аснове | націск на канчатку |
|---|---|---|---|---|
| Т. | старастам<br>дзядзькам | слугой(-ою)<br>суддзёй(-ёю) | Васем<br>Данілам | Фамой(-ою)<br>Ільёй(-ёю) |
| М. | (аб) старасце<br>дзядзьку | слузе<br>суддзі | Васю<br>Даніле | Фаме<br>Ільі |

## 2. Назоўнікі — назвы маладых істот

| Склон | Адзіночны лік | | Множны лік | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | дзіця (-ё) | бусляня (-ё) | дзеці | бусляняты |
| Р. | дзіц-яц-і | буслян-яц-і | дзяцей | бусляня т☐ |
| Д. | дзіц-яц-і | буслян-яц-і | дзецям | буслянятам |
| В. | дзіця (-ё) | бусляня (-ё) | дзяцей | буслянят☐ |
| Т. | дзіцём (-ем) | буслянём | дзецьмі | буслянятамі |
| М. | (аб) дзіц-яц-і | буслян-яц-і | (аб) дзецях | буслянятах |

## 3. Назоўнікі на -мя (імя, племя, стрэмя)

| Склон | Адзіночны лік | | Множны лік | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | імя | племя | ім-ён-ы | плям-ён-ы |
| Р. | імя (ім-ен-і) | племя<br>(плем-ен-і) | ім-ён☐<br>(ім-ён-аў) | плям-ён☐<br>(плям-ён-аў) |
| Д. | імю (ім-ен-і) | племю<br>(плем-ен-і) | ім-ён-ам | плям-ён-ам |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Адзіночны лік | | Множны лік | |
|---|---|---|---|---|
| В. | імя | племя | ім-ён-ы | плям-ён-ы |
| Т. | імем (ім-ен-ем) | племем (плем-ен-ем) | ім-ён-амі | плям-ён-амі |
| М. | (аб) імі (ім-ен-і) | племі (плем-ен-і) | (аб) ім-ён-ах | плям-ён-ах |
| Імя, стрэмя ў множным ліку могуць скланяцца без суфікса -ён-: Н.: імі, стрэ́мі; Р.: імяў, стрэмяў; Д.: імям, стрэмям; Т.: імямі, стрэмямі; М.: (аб) імях, стрэмях | | | | |

## 4. Назоўнікі агульнага роду

| Склон | Націск на аснове | | | | Націск на канчатку | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | м. р. | | ж. р. | | м. і ж. р. | |
| Н. | мурза бадзяга | абжора соня | мурза бадзяга | абжора соня | сірата | ляўша |
| Р. | мурзы бадзягі | абжоры соні | мурзы бадзягі | абжоры соні | сіраты | ляўшы |
| Д. | мурзу бадзягу | абжору соню | мурзе бадзязе | абжоры соні | сіраце | ляўшы |
| В. | мурзу бадзягу | абжору соню | мурзу бадзягу | абжору соню | сірату | ляўшу |
| Т. | мурзам бадзягам | абжорам сонем | мурзай (-аю) бадзягай (-аю) | абжорай (-аю) соняй (-яю) | сіратой (-ою) | ляўшой (-ою) |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Націск на аснове | | | | Націск на канчатку | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | м. р. | | ж. р. | | м. і ж. р. | |
| М. | (аб) мурзе бадзягу | (аб) абжору соню | (аб) мурзе бадзязе | (аб) абжоры соні | (аб) сіраце | (аб) ляўшы |

• Назоўнікі на г, х і з націскам на аснове ў давальным і месным склонах маюць канчатак -е пры абавязковым чаргаванні г//з', х//с': хапуга — хапузе, чысцёха — чысцёсе, а назоўнікі на к — канчатак -ы пры чаргаванні к//ц: зазнайка — зазнайцы.
• Словы гняўко́, нямко́, хвалько́ скланяюцца толькі тады, калі адносяцца да асоб мужчынскага полу.
• Імёны тыпу Валя, Лёня, Саша, Слава, Шура скланяюцца як назоўнікі агульнага роду

# Скланенне назоўнікаў на -анін (-янін), -ын

| Склон | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| Н. | мінчанін□ селянін□ татарын □ | мінчане сяляне татары |
| Р. | мінчаніна селяніна татарына | мінчан□ сялян□ татар□ |
| Д. | мінчаніну селяніну татарыну | мінчанам сялянам татарам |
| В. | як Р. | як Р. |
| Т. | мінчанінам селянінам татарынам | мінчанамі сялянамі татарамі |
| М. | (аб) мінчаніне селяніне татарыне | (аб) мінчанах сялянах татарах |

Гэтыя назоўнікі з лічэбнікамі 2, 3, 4 утвараюць спалучэнні тыпу два (тры, чатыры) мінчаніны, селяніны, татарыны, а са зборным лічэбнікам спалучэнні тыпу двое (трое і г. д.) мінчан, сялян, татар



© ТДА «Аверсэв»

# Скланенне назоўнікаў у множным ліку

| Склон | 1-е скланенне | 2-е скланенне | 3-е скланенне | агульны род |
|---|---|---|---|---|
| Н. | зімы ружы казкі бітвы песні | дамы ласі азёры вучні вочы госці | далечы сенажаці печы борці | сіроты мурзы бадзягі соні |
| Р. | зім☐ руж☐ казак☐ бітваў песень (песняў) | дамоў ласёў азёр (азёраў) вучняў вачэй гасцей | далечаў сенажацей (-яў) пячэй (печаў) борцей (-яў) | сірот☐ мурзаў бадзяг☐ сонь☐ |
| Д. | зімам ружам казкам бітвам песням | дамам ласям азёрам вучням вачам гасцям | далечам сенажацям печам борцям | сіротам мурзам бадзягам соням |
| В. | як Н. або Р. | як Н. або Р. | як Н. або Р. | як Р. |
| Т. | зімамі ружамі казкамі бітвамі песнямі | дамамі ласямі азёрамі вучнямі вачамі (-ыма) гасцямі | далечамі сенажацямі печамі борцямі | сіротамі мурзамі бадзягамі сонямі |
| М. | (аб) зімах ружах казках бітвах песнях | (аб) дамах ласях азёрах вучнях вачах гасцях | (аб) далечах сенажацях печах борцях | (аб) сіротах мурзах бадзягах сонях |

- Назоўнік людзі ў творным склоне ўжываецца з канчаткамі -мі: людзьмі.
- Асобныя назоўнікі ў творным склоне ўжываюцца з варыянтнымі канчаткамі: вачамі — вачыма, грашамі — грашыма, дзвярамі — дзвярыма, вушамі — вушыма, грудзямі — грудзьмі, санямі — саньмі

© ТДА «Аверсэв»

# Нескланяльныя назоўнікі

Нескланяльнымі назоўнікамі называюцца такія, якія не змяняюцца па склонах і не маюць склонавых канчаткаў.
Склон і лік нескланяльных назоўнікаў вызначаецца паводле іх сувязі з іншымі словамі і сінтаксічнай функцыі ў сказе: першая лінія (чаго?) метро — родны склон, праехаць (на чым?) на метро — месны склон.

| Нескланяльныя назоўнікі | Прыклады |
|---|---|
| 1. Агульныя назоўнікі іншамоўнага паходжання, якія канчаюцца на галосны гук | амплуа, журы, дэпо, паліто, калібры, метро, шымпанзэ, кімано, мулінэ |
| 2. Іншамоўныя назоўнікі ж. р. з асновай на зычны, у тым ліку імёны, прозвішчы, геаграфічныя назвы | мадам, лэдзі, пані, місіс, Эжэн, Элізабет, Зегерс |
| 3. Славянскія на -іх (-ых) і на о націскное | у Ніны Сядых, у Васі Сядых<br>у Веры Гурло, у Васі Гурло |
| 4. Прозвішчы, якія канчаюцца на зычны і адносяцца да асоб ж. р. | Таня Русак, Тані Русак, з Таняй Русак |
| 5. Абрэвіятуры, утвораныя:<br>а) з пачатковых вялікіх літар;<br>б) з пачатковых гукаў, апошні з якіх галосны;<br>в) з часткі аднаго назоўніка з формай ускоснага склону другога;<br>г) з часткі слова і гукаў іншых слоў, апошні з якіх галосны | <br>БДУ, БДПУ імя Максіма Танка;<br>ФІФА (ФІФА рашыла, рашэнне ФІФА);<br>каманда кампалка, па камандзе кампалка;<br>аблана, гарана |

# Скланенне прозвішчаў і геаграфічных назваў

| Склон | Прозвішчы на -ін (-ын), -аў (-оў), -еў (-ёў) | Назвы на -ін (-ын), -аў (-оў), -еў (-ёў) |
|---|---|---|
| Н. | Кузьмін, Шмакаў, Лосеў, Кавалёў | Жлобін, Барысаў, Лоеў |
| Р. | -а | -а |
| Д. | -у | -у |



© ТДА «Аверсэв»

| Склон | Прозвішчы на -ін (-ын), -аў (-оў), -еў (-ёў) | Назвы на -ін (-ын), -аў (-оў), -еў (-ёў) |
|---|---|---|
| В. | -а | -□ |
| Т. | -ым | -ам |
| М. | (аб) -е | -е |

• Іншамоўныя прозвішчы на -ін (-ын), -аў (-оў) у творным склоне ўжываюцца з канчаткам -ам (-ом): Дарвінам, Чаплінам

## Скланенне прозвішчаў на -а (-я)*

**Мужчынскія прозвішчы**

Прозвішчы — назвы прадметаў ж. р. скланяюцца, як агульныя назоўнікі

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. Янка | Хмара | Груша | Зязюля |
| Р. Янкі | Хмары | Грушы | Зязюлі |
| Д. Янку | Хмары | Грушы | Зязюлі |
| В. Янку | Хмару | Грушу | Зязюлю |
| Т. Янкам | Хмарай | Грушай | Зязюляй |
| М. (аб) Янку | Хмары | Грушы | Зязюлі |

Прозвішчы — назвы ж. р. з асновай на г, к, х

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. Вася | Крыга | Пчолка | Муха |
| Р. Васі | Крыгі | Пчолкі | Мухі |
| Д. Васю | Крыгу | Пчолку | Муху |
| В. Васю | Крыгу | Пчолку | Муху |
| Т. Васем | Крыгам | Пчолкам | Мухам |
| М. (аб) Васю | Крыгу | Пчолку | Муху |

Прозвішчы на -еня (-эня, -аня), -уня (-юня)

| | | |
|---|---|---|
| Н. Кузьма | Крупеня | Місюня |
| Р. Кузьмы | Крупені | Місюні |
| Д. Кузьме | Крупені | Місюні |
| В. Кузьму | Крупеню | Місюню |
| Т. Кузьмой | Крупеняй | Місюняй |
| М. (аб) Кузьме | Крупені | Місюні |



© ТДА «Аверсэв»

| Жаночыя прозвішчы | | | |
|---|---|---|---|
| Прозвішчы — назвы прадметаў ж. р. скланяюцца, як агульныя назоўнікі | | | |
| Н. Алеся | Хмара | Груша | Зязюля |
| Р. Алесі | Хмары | Грушы | Зязюлі |
| Д. Алесі | Хмары | Грушы | Зязюлі |
| В. Алесю | Хмару | Грушу | Зязюлю |
| Т. Алесяй | Хмарай | Грушай | Зязюляй |
| М. (аб) Алесі | Хмары | Грушы | Зязюлі |
| Прозвішчы — назвы ж. р. з асновай на г, к, х | | | |
| Н. Юля | Крыга | Пчолка | Муха |
| Р. Юлі | Крыгі | Пчолкі | Мухі |
| Д. Юлі | Крызе | Пчолцы | Мусе |
| В. Юлю | Крыгу | Пчолку | Муху |
| Т. Юляй | Крыгай | Пчолкай | Мухай |
| М. (аб) Юлі | Крызе | Пчолцы | Мусе |
| Прозвішчы на -еня (-эня, -аня), -уня (-юня) | | | |
| Н. Ніна | Крупеня | Місюня | |
| Р. Ніны | Крупені | Місюні | |
| Д. Ніне | Крупені | Місюні | |
| В. Ніну | Крупеню | Місюню | |
| Т. Нінай | Крупеняй | Місюняй | |
| М. (аб) Ніне | Крупені | Місюні | |
| Прозвішчы — назвы ж. р. з націскам на канчатку скланяюцца, як назоўнікі 1-га скланення незалежна ад полу асобы | | | |
| Н. Алег, Вера | Вярба | Крапіва | Парахня |
| Р. Алега, Веры | Вярбы | Крапівы | Парахні |
| Д. Алегу, Веры | Вярбе | Крапіве | Парахні |
| В. Алега, Веру | Вярбу | Крапіву | Парахню |
| Т. Алегам, Верай | Вярбой | Крапівой | Парахнёй |
| М. (аб) Алегу, Веры | Вярбе | Крапіве | Парахні |



© ТДА «Аверсэв»

| Прозвішчы — назвы н. р. ці назвы, род якіх выразна не выступае, скланяюцца толькі ў тых выпадках, калі суадносяцца з асобамі м. р. | | | |
|---|---|---|---|
| Н. Віктар | Шыла | Броўка | Сыракомля |
| Р. Віктара | Шылы | Броўкі | Сыракомлі |
| Д. Віктару | Шылу | Броўку | Сыракомлю |
| В. Віктара | Шылу | Броўку | Сыракомлю |
| Т. Віктарам | Шылам | Броўкам | Сыракомлем |
| М. (аб) Віктару | Шылу | Броўку | Сыракомлю |

Імёны і прозвішчы асоб м. р., якія канчаюцца на мяккі знак, й, заднеязычныя (г, к, х), шыпячыя (ж, дж, ч, ш), р і ц, у месным склоне ўжываюцца з канчаткамі -у (-ю): (аб) Алесю, (аб) Гогалю, (аб) Сяргею, (аб) Мележу, (аб) Шылеру

* Гл.: Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Мінск, 1959.

## Нескланяльныя прозвішчы

| Прозвішчы | Прыклады |
|---|---|
| 1. Уласныя і іншамоўныя прозвішчы, якія канчаюцца на націскное -о | Бузó, Гурлó, Круцькó, Гюгó, Дзідрó, Дэфó, Русó |
| 2. Іншамоўныя прозвішчы на -ё, -а, якія стаяць на канцы слова пасля галосных ці пасля мяккага знака, | Бакачыа, Галілеа, Маа, Мельё, Бадальё |
| але: прозвішчы на -о, якімі з'яўляюцца назвы прадметаў ніякага роду тыпу *вясло*, скланяюцца, калі абазначаюць асоб мужчынскага полу | |
| 3. Прозвішчы на -іх (-ых) | Крутых, Буйскіх, Чарных |
| 4. Многія іншамоўныя прозвішчы на -а (-я) | Дзюбуа, Заля, Бруна, Халіла, Ціта |
| 5. Іншамоўныя прозвішчы на -і (-ы), -е (-э), -у (-ю) | Вердзі, Куінджы, Эйве, Бізэ, Нэру, Шэню |



© ТДА «Аверсэв»

# Спосабы ўтварэння назоўнікаў

| Спосаб утварэння | Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральны сродак | Вытворнае слова |
|---|---|---|---|
| Суфіксальны | чай<br>выкладаць | чай + нік<br>выклад + чык | чайнік<br>выкладчык |
| Бяссуфіксны (нульсуфіксальны) | грукаць<br>глухі (х//ш) | грук + ∅<br>глуш + ∅ | грук<br>глуш |
| Прыставачны | парадак<br>куток | бес + парадак<br>за + куток | беспарадак<br>закутак |
| Прыставачна-суфіксальны | лес<br>зуб | пад + лес + ак<br>за + зуб + ень | падлесак<br>зазубень |
| Прыставачна-нульсуфіксальны | слухаць<br>сіні | не + слух + ∅<br>про + сінь + ∅ | неслух<br>просінь |
| Складанне | плашч, палатка<br>лес, тундра | плашч + палатка<br>лес + тундра | плашч-палатка<br>лесатундра |
| Складана-суфіксальны | ваду качаць<br>водныя лыжы | вад + а + кач + к(а)<br>водн + а + лыж + нік | вадакачка<br>воднalыжнік |
| Абрэвіяцыя | Цэнтральны ўніверсальны магазін<br>камандзір батальёна | Ц + У + М<br>кам + бат | ЦУМ<br>камбат |



© ТДА «Аверсэв»

# Правапіс суфіксаў

-ак ← выпадае ← Пры змяненні слова галосны ў суфіксе → не выпадае → -ік (-ык)

арэшак (арэшка)
дубочак (дубочка)

хвойнік (хвойніку)
пішчык (пішчыка)

-ачк- ← цвёрды, зацвярдзелы ← Апошні гук перад суфіксам → мяккі → -ечк-

вудачка, лямпачка,
Тамарачка

зязюлечка, гняздзечка,
Валодзечка

Мяккі знак пішацца ў словах:
- з суфіксам -еньк-, -аньк-: ручанька, зязюленька
- пасля мяккіх перад -к-: песенька, Алеська
- пасля [л’], [н’] перад -чык: пальчык, агеньчык

# Правапіс складаных назоўнікаў

| Разам | Праз злучок |
|---|---|
| 1. Утвораныя з дапамогай злучальных галосных о, а, е, я: цеплаход, конезавод, канявод.<br>2. Першая частка якіх — лічэбнік, напісаны літарамі: пяцігодка.<br>3. Назвы гарадоў з часткамі град, гарад, горск: Петраград, Слаўгарад, Салігорск.<br>4. Першая частка якіх — дзеяслоў у форме 2-й ас. адз. л. загаднага ладу: вярнідуб, пакацігарошак; але: перакаці-поле, узвей-вецер.<br>5. Першая частка якіх — іншамоўныя часткі касма, электра і інш.: аўтагонкі, бензапіла, касманаўтыка, электратэхніка.<br>6. Складанаскарочаныя словы: ваенкамат, гарсавет | 1. Утвораныя з самастойных слоў без злучальных галосных: прэм’ер-міністр, жар-птушка, школа-інтэрнат, баба-яга.<br>2. Назвы палітычных партый, іх прыхільнікаў: сацыял-дэмакратычны, сацыял-дэмакрат.<br>3. Складаныя прозвішчы, геаграфічныя назвы: Новік-Пяюн, Буда-Кашалёва.<br>4. Складаныя адзінкі вымярэння: грам-малекула, тона-кіламетр; але: працадзень.<br>5. Геаграфічныя назвы з часткай паў: паў-Беларусі, паў-Мінска.<br>6. Назоўнікі з аднаслоўным прыдаткам: конь-скакун, дзед-мароз |



© ТДА «Аверсэв»

| Разам | Праз злучок |
|---|---|
| 7. Назвы паселішчаў з пачатковай часткай Нова- (Нава-), Стара-, Верхне- (Верхня-), Ніжне- (Ніжня-), Сярэдне- (Сярэдня-) і інш.: Новалукомль, Наваельня, Старасельцы, Верхнядзвінск, Ніжнякамск.<br>8. Першая частка якіх іншамоўная аэра-, вела-, мота-, метэа-, касма-, электра-, макра- і інш.: аэраздымак, велагонкі, метэазводкі, бензапіла, стэрэатруба, мікратэлефон | 7. Назоўнікі з пачатковымі часткамі віцэ-, максі-, міні-, экс-, прэс-, блок- і інш.: віцэ-канцлер, максі-спадніца, обер-майстар, прэс-служба, блок-пункт;<br>**але:** блокпост.<br>8. Назвы населеных пунктаў з часткамі Усць-, Верх-, Соль-: Усць-Ілім, Верх-Ільмень, Соль-Ілецк.<br>9. Іншамоўныя ўласныя імёны з пачатковымі часткамі Ван-, Мак-, Нью-, Сен-, Сент-, Санкт- і канцавымі часткамі -хан, -шах, -паша, -бай, -аглы і інш.: Ван-Дэйк, Нью-Дэлі, Сен-Жуст, Чынгіз-хан, Асман-паша, Турсун-задэ |

# Правапіс НЕ (НЯ), НІ з назоўнікамі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| 1. Калі слова без не (ня) не ўжываецца: непаседа, нястача.<br>2. Калі слова з не (ня) можна замяніць сінонімам без не (ня): невыразнасць (цьмянасць), нянавісць (варожасць) | 1. Калі ў сказе ёсць ці падразумяваецца супрацьпастаўленне: Ён мне не прыяцель, а знаёмы.<br>2. Калі адмаўляецца тое, што выражана назоўнікам, які стаіць пасля не: Быў я не зломак, не пустадомак |
| Ні заўсёды асобна: У няўмечкі не баляць ні рукі, ні плечкі. | |

# Марфалагічны разбор назоўніка

## Парадак разбору

1. Часціна мовы. Агульнае значэнне.
2. Пачатковая форма.
3. Марфалагічныя прыметы:
а) нязменныя: агульны ці ўласны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, канкрэтны ці абстрактны, зборны, рэчыўны; род; скланенне;
б) зменныя: склон, лік.
4. Сінтаксічная роля.



© ТДА «Аверсэв»

## Узор разбору

А сок быў свежы, такі хвацкі, такі салодкі, забіяцкі! (Я. Колас).

*Сок* — назоўнік, абазначае прадмет:
(што?) *сок*; пачатковая форма — *сок*;
агульны, неадушаўлёны, рэчыўны; мужчынскага роду; 2-га скланення;
ужыты ў назоўным склоне, адзіночным ліку.
У сказе з'яўляецца дзейнікам.

# Прыметнік як часціна мовы

| | |
|---|---|
| **Агульнае граматычнае значэнне** | абазначае прымету прадмета: блакітнае неба, друкарскі станок, салаўіная песня |
| **Адказвае на пытанні** | які? якая? якое? якія? → шчаслівая пара, вясковая вуліца,<br>чый? чыя? чыё? чые? → бацькаў дом |
| **Пачатковая форма** | Н. скл., адз. л., м. р.: чырвоны, залаты, бабулін |
| **Марфалагічныя прыметы** | Прыметнікі дапасуюцца да назоўнікаў і змяняюцца:<br>• па родах (у адзіночным ліку):<br>м. р.: сіні касцюм,<br>ж. р.: сіняя кветка,<br>н. р.: сіняе неба;<br>• па ліках:<br>новы дом, новыя дамы;<br>• па склонах:<br>Н., Р., Д., В., Т., М.;<br>• могуць мець ступені параўнання (якасныя):<br>вышэйшую (святлейшы),<br>найвышэйшую (найсвятлейшы) |
| **Сінтаксічная роля** | Азначэнне: Ціха ў зімовым лесе.<br>Выказнік: Неба высокае. |



© ТДА «Аверсэв»